№№147—148
(2667—2668)

13 верасня 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

СЕНСАЦИЯ

Владимир Коноплев уйдет по состоянию здоровья?

Председатель Палаты представителей Национального собрания Беларуси Владимир Коноплев подал заявление об отставке. Во вторник, 11 сентября, эту сенсационную новость распространили информационные агентства

Заявление Коноплева включено в повестку дня предстоящей сессии Палаты представителей для принятия соответствующего решения. Планируется, что 2 октября депутаты рассмотрят вопрос об избрании нового председателя Палаты представителей.

Кстати, как сообщило Белорусское телеграфное агентство, А.Лукашенко *"проинформирован о готовящихся кадровых изменениях в руководстве высшего органа законодательной власти страны"*.

По словам депутатов, пока сложно сказать, кто возглавит Палату представителей. Называются самые разные фамилии.

"Скорее всего место Коноплева займет председатель одной из комиссий, — предположили депутаты, которым дозвонилась "Народная воля". — *Вполне вероятно, что могут выбрать, например, того же Александра Архипова. Кстати, новому председателю Палаты представителей придется не так уж и долго работать — в следующем году должны состояться парламентские выборы. А может, и никто не возглавит — эти пару сессий может запросто провести и теперешний заместитель Коноплева Сергей Заболотец".*

Сейчас Владимир Коноплев официально находится в отпуске. По нашей информации, Владимир Николаевич отдыхает вместе со своей супругой.

Некоторые народные избранники говорят, что слышали о том, что у Коноплева действительно были проблемы со здоровьем. В определенных кругах даже поговаривали, что Владимир Николаевич якобы ездил на лечение в Санкт-Петербург и даже намеревался делать там операцию...

Между тем некоторые общественные и политические деятели заявили, что несильно верят, будто Коноплев решил уйти в отставку только по состоянию здоровья.

"Как-то очень быстро все произошло, — сказал журналистам экс-председатель Совета Республики **Александр Войтович**. — *Конечно, я могу только предполагать, что за этим стоит. Состояние здоровья — это, конечно, одна из возможных причин отставки, хотя я думаю, что причина другая. Это обычный прием, когда нужно, чтобы ушел с высокого поста госслужащий. Когда Лукашенко отзывал меня из Совета республики, глава Администрации президента Урал Латыпов предложил мне написать заявление по собственному желанию. Я не хотел врать, что у меня плохое здоровье, и не стал ничего писать. Думаю, что, возможно, у Лукашенко с Коноплевым обострились отношения, и тот решил с ним расстаться. Возможно, Коноплев сам принял такое решение — уйти из команды Лукашенко. Тогда это значимое события. Я думаю, что в ближайшем будущем мы все поймем".*

"Логика любой авторитарной системы — кадры должны тасоваться, — говорит политик **Николай Статкевич**. — *А те, кто заявляет о своей излишней самостоятельности, самодостаточности, должны убираться. Коноплев демонстрировал такую самодостаточность, уверенность. В том числе финансовую. И, наверное, стал подозреваться в амбициях. Наверное, был не совсем управляем. Вообще, я бы сказал, что в окружении Лукашенко гуляют волны неуверенности. Даже там поняли, что белорусский колхоз не самодостаточен экономически. Москва поддержку сворачивает, а часть номенклатуры требует реформ".*

Напомним, что в последнее время в Интернете появлялись слухи о том, что личностью Коноплева будто бы заинтересовались правоохранительные органы, писали, что был задержан его личный водитель. Однако эту информацию пресс-служба Палаты представителей и помощники Коноплева оставляли без комментариев.

"На самом деле, мы знаем о нем и много, и мало, — написал в своем интернет-дневнике бывший чиновник **Александр Федута**. — *Мы знаем, например, что он встречался с Карпенко — одним из последних. И не знаем, о чем они говорили. Мы знаем, что они с Гончаром не любили друг друга. И не знаем, играл ли какую-нибудь роль Коноплев в судьбе Гончара. Я бы сказал так: в судьбе Гончара и Захаренко. Потому что в судьбе Винниковой — сыграл.*

А Гончар... Когда-нибудь мы узнаем и об этом..."

Марина КОКТЫШ.

Кстати
Кто еще из белорусских чиновников жаловался на здоровье?

Экс-управляющая делами президента **Галина Журавкова** заболела перед самым оглашением приговора Верховного суда по ее уголовному делу. Сама Галина Анисимовна говорила, что перенесла довольно тяжелую операцию.

По состоянию здоровья ушел из власти бывший помощник президента **Михаил Сазонов**.

Были проблемы со здоровьем и у бывшего председателя КГБ, а ныне — посла Беларуси в Сербии **Владимира Мацкевича**. Сообщалось, что он лечился в Германии и что Александр Григорьевич Лукашенко помог ему оплатить лечение.

КАДРЫ

Зоркапад

Новапрызначаных сілавікоў Аляксандр Лукашэнка павысіў у званнях.

Так, старшыня Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў **Ігар Рачкоўскі** атрымаў прызначэнне на гэтую пасаду, будучы палкоўнікам. У аўторак яму было прысвоена званне генерал-маёра.

Кіраўнік Службы бяспекі прэзідэнта **Андрэй Уцюрын** заняў гэтую высокую пасаду, будучы падпалкоўнікам. Зараз ён ужо палкоўнік, але, думаецца, да генерала нядоўга засталося. Была б пасада — званне прысвоіцца.

Ці хавалі мы Караджыча?

Былы памочнік галоўнага пракурора Міжнароднага трыбунала па былой Югаславіі Флорэнс Хартман напісала кнігу "Свет і пакаранне", у якой сцвярджае, што Расія прадухіліла арышт лідэра баснійскіх сербаў Радавана Караджыча ў 1997 годзе. Ф.Хартман паведамляе, што ў лістападзе 1997 года лідэр баснійскіх сербаў тайна хаваўся ў Беларусі, пакуль войскі НАТО шукалі яго ў Боснії.

Не задаволіў...

Вярхоўны суд Беларусі не задаволіў скаргу ініцыятыўнай групы грамадзян на Цэнтральную выбарчую камісію. Актывісты меліся збіраць подпісы за адмену кантрактнай сістэмы. Яны прасілі суд скасаваць рашэнне ЦВК аб адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы.

Суддзя Жукоўская палічыла, што прапановы аб скасаванні кантрактнай сістэмы... не адпавядаюць дзейнаму заканадаўству, а таму ніякага збору подпісаў быць не можа.

Але ініцыятыва грамадзян і накіравана на адмену гэтага самага заканадаўства. І, дарэчы, па Канстытуцыі яны маюць права на заканадаўчую ініцыятыву. Але, на жаль, толькі на паперы...

Лілія ВОРАНАВА.

АНОНС

«Сумерки»
Александра Яковлева — рассвет для будущих поколений

"Народная воля" продолжает публиковать главы из книги Александра Яковлева — известного общественного и политического деятеля, историка и дипломата, академика, человека, который в эпоху Перестройки (1985—1991) стал одним из лидеров процесса реформирования страны на принципах свободы человека и гражданского общества.

Книга "Сумерки" — не просто воспоминания о прожитом, это глубокое исследование советского социально-политического строя и его эволюции, анализ преступных методов правления страной руководства КПСС, приведших к политическому и экономическому краху ленинско-сталинского фашистского режима. В книге подробно рассматриваются истоки, противоречия и трудности первой "бархатной революции" на пространстве социалистически ориентированных стран, которая получила название Перестройки.

Учитывая то, что книга А.Яковлева "Сумерки" издана очень малым тиражом и в Беларуси о ней почти никто не знает, редакция "Народной воли" решила продолжить публикацию ее глав.

"Сумерки" Александра Яковлева — рассвет для будущих поколений людей постсоветского пространства.



ІХ ТРЭБА ВЕДАЦЬ У ТВАР

Хто яна, Вольга Смірнова?

Можна падумаць, што з дапамогай судоў улады пачалі сапраўднае паляванне на Паўла Севярынца. Канвеер "запусціла" брэсцкі суддзя Вольга Смірнова, якая пакарала маладзёжнага актывіста 15 суткамі адміністрацыйнага арышту.

Пра сябе суддзя Смірнова нічога не хоча распавядаць журналістам. Як і не каментуе прысуд Паўлу. Аднак намеснік старшыні раённага суда Марыя Леванчук расказала, што ў калегі вышэйшая юрыдычная адукацыя і пэўны стаж работы.

Вольга Конанаўна Смірнова працуе ў Маскоўскім раённым судзе Брэста два гады. Але для яе гэта пакуль што часовая праца — Смірнова замяшчае адну з суддзяў, якая пайшла ў дэкрэтны адпачынак. Вядома і тое, што раней Смірнова працавала ў Маларыцкім раённым судзе суддзёй па адміністрацыйных справах.

Дарэчы, рэха брэсцкай *"справы Севярынца"* яшчэ не адгучала, хаця хлопец ужо паспеў трапіць на новую адсідку. На 12 верасня скончаны усяго пяць спраў тых, хто браў удзел у прэзентацыі кніг Паўла. Тры пратаколы адпраўлены на дапрацоўку ў райаддзел міліцыі: на Рамана Кісляка, Андрэя Шарэнду і Кацярыну Бельскую. Атрымалі штрафы Юрась Бакур — тры базавыя велічыні, Яўген Бяласін, Вячаслаў Круглоў і Сяргей Лазенка — па дзве.

Любоў Праневіч атрымала папярэджанне.

Справу Яўгена Бяласіна, так званага беспрацоўнага палітыка, дапытлівага перакладчыка і моваазнаўцу, былога выкладчыка БрДУ, таксама разглядала Вольга Смірнова. Вось як Яўген пракаментаваў тое рашэнне:

— Я падаў суддзі Вользе Смірновай хадайніцтва на яе адвод. Зыходзіў з таго, што, як мне здаецца, яна была напрамую зацікаўлена ў абвінаваўчым ухіле справы, хаця б таму, што ўжо паспела асудзіць Севярынца. Маё хадайніцтва не было задаволена.

Другое маё хадайніцтва — каб пасяджэнне вялося на беларускай мове — таксама не задаволілі. Зараз у нас дзве дзяржаўныя мовы, і яны — раўнапраўныя. Дык чаму суддзя размаўляе па-расійску?.. Чаму прапаноўвае мне перакладчыка?..

Я прапанаваў суддзі прыняць ад мяне падарунак — юрыдычны даведнік на беларускай мове, аднак яна яго не прыняла.

Зараз магу шчыра сказаць: гэта быў прэцэдэнт.

Аляксандр КАВАЛЬЧУК.
Брэст.

На здымку: *Суддзя Вольга Смірнова, якая прысудзіла Паўлу Севярынцу 15 сутак адміністрацыйнага арышту. За што? Адказ на гэтае пытанне ведаюць усе.*

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Чарговы арышт Паўла Севярынца

У леспрамгасе Паўлу Севярынцу было, можа, нават лягчэй, чым сёння...

На гэтым тыдні Баранавіцкі раённы суд вынес прыгавор палітыку Паўлу Севярынцу: 17 сутак адміністрацыйнага арышту і штраф у памеры 20 базавых велічынь (620 тысяч рублёў).

Паўла Севярынца затрымалі ля Баранавіцкага раённага суда, куды ён прыйшоў, каб падтрымаць маладзёжнага актывіста Яраслава Грышчэню, якога судзілі за ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт".

Суд прызнаў вінаватым Паўла адразу па трох артыкулах: дробнае хуліганства, непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі і парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавага мерапрыемства альбо пікетавання. Нагадаем, што ў Баранавічах на "суткі" Павел Севярынец патрапіў праз некалькі дзён пасля выхаду з брэсцкага ізалятара.

— Што я магу сказаць наконт чарговага прысуду? — кажа маці Паўла Севярынца Таццяна Яўгенаўна. — Улада баіцца моладзі, баіцца Пашы... Такая асоба, як сын, — для іх небяспечная. Павел — харызматычны чалавек, уплывае на людзей, я бачыла, як да яго трапятліва ставяцца. І я разумею, што нешта трэба рабіць, каб не падстаўляцца больш. З другога боку, сын прадчуваў і казаў мне аб тым, што ў Баранавічах яго хутчэй за ўсё пасадзяць. Разумеў, але ж была і адказнасць за тых дзетак, якія пайшлі за ім і якіх судзяць. Хоць усе гэтыя "суткі", натуральна, здароўя не дадаюць.

— Дрэннае здароўе?

— Не з лепшых. Мы рабілі кардыяграму, і яна мяне вельмі непакоіць. Яшчэ раней урачы паставілі Пашы дыягназ: парок сэрца. А зараз праверыліся, урач кажа: "Патрэбна пастаяннае назіранне кардыёлага". Калі бачыш паперку — гэта адно, а калі такія прысуды... Я ж бачу, як у сына часам чарнеюць пазногці, сінеюць губы... Але ж Павел не падае выгляду, нават калі яму вельмі дрэнна. Нават жартуе. Кажа: "Мама, на "сутках" я хоць адасплюся".

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
13 ВЕРАСНЯ 2007 г.

АБЗАЦЕМ

Размер помощи увеличен

В Беларуси увеличены размеры помощи многодетным семьям по погашению кредитов, взятых на строительство жилья.

В частности, предусмотрено, что для семей, имеющих троих детей, помощь государства составит 50% от суммы задолженности по льготному кредиту, четверых — 70%, пятерых и более детей — 100%.

Они уходят

Польские пограничники и таможенники прекращают работу на белорусской территории международного автомобильного перехода "Брест—Тересполь".

Как сообщила пресс-служба таможни "Западный Буг", согласно поступившему на таможню уведомлению польской стороны, произойти это должно в ночь на 15 сентября. Упомянутый погранпереход — единственный пограничный пункт пропуска таможни "Западный Буг", где на выезд из РБ осуществлялся совместный пограничный и таможенный контроль. Так польские и белорусские службы работали здесь с 1992 года, при этом на въезд в Республику Беларусь контроль всегда был раздельным — таможенные и пограничные службы двух государств работали на своих территориях. Нынешние изменения продиктованы вхождением Польши с 1 января 2008 года в Шенгенское соглашение.

«Белоруснефть» идет на рекорд

РУП "ПО "Белоруснефть" ведет бурение параметрической скважины глубиной около 5750 метров в Речицком районе в пойме реки Березина. Она станет самой глубокой в Беларуси.

Знай наших!

Своеобразный рекорд на чемпионате Европы по волейболу среди мужчин принадлежит игроку сборной Хорватии Тимофею Жуковскому.

Он в свои неполных 18 лет стал самым молодым участником этих престижных соревнований. У нас есть все основания порадоваться за Тимофея, потому что он выходец из Беларуси. В Хорватию его в 1995 году в шестилетнем возрасте привез отец Михаил, который в то время трудился там по приглашению федерации волейбола этой страны. Надо заметить, что Михаил Жуковский раньше работал врачом в волейбольной команде минского СКА.

Памятник дворнику

В Лиде установят памятник дворнику.

Таким образом горожане хотят подчеркнуть свое уважение к тем, кто содержит город в чистоте и порядке. Воплотить задумку взялся местный литейно-механический завод. Мастера уже приступили к работе над забавной фигуркой человека с метлой. Планируется, что скульптура будет изготовлена к концу года. Установить ее предполагается в центре города.

АСОБА

Апантаны беларускасцю

Пісьменніку Уладзіміру Содалю — 70!

З ім гутарыць Ірына МАРАЧКІНА:

— Спадар Уладзімір, 70-я гады мінулага стагоддзя нам выпала працаваць разам. Вы былі рэдактарам навучальных праграм на Беларускім тэлебачанні, я ж — іх метадыстам. Ужо тады я зразумела, што роднае слова для вас — сэнс жыцця. Памятаеце, як за кароткі час нашымі сумеснымі намаганнямі на беларускую мову з рускай былі перакладзены тэлеўрокі па біялогіі, хіміі, гісторыі Беларусі. Нашымі аўтарамі былі Георгі Штыхаў, Аляксей Кароль, Зміцер Санько, Валер Грыцук, Ігар Карабанаў, якія выдатна валодаюць роднай мовай. Мы працавалі на беларускую школу. У нас была падтрымка "зверху" ў асобе старшыні Белтэлерадыёкампаніі Генадзя Бураўкіна. Аднак некаму гэта муліла вока, і рэдакцыю навучальных перадач спакваля пачалі зліквідоўваць.

Прыгадайце, калі ласка, тыя гады. Наколькі мне помніцца, сыр-бор разгарэўся пасля ліста, які Вы даслалі ў Міністэрства адукацыі. Што гэта быў за ліст?

— Гэта быў ліст-пратэст, у якім я выказваў сваю нязгоду са спробай Міністэрства асветы беларускамоўнае навучальнае тэлебачанне скіраваць у рускамоўнае рэчышча. Рэзананс гэтага ліста быў гучны. Неяк мне патэлефанавала тагачасная намесніца міністра асветы Ганна Канцавая. "Вы пісалі да нас ліст пра навучальнае тэлебачанне?" — пацікавілася яна. "Пісаў, — кажу. — Ну і што?" — "То працуйце, як працавалі!" — "Але мне гэтага мала, — запярэчыў я. — На свой ліст я хацеў бы мець пісьмовае сведчанне!" Гэтая мая рэпліка аж ускруціла начальніцу: "Што, вам мала званка намесніка міністра?" — "Мала! — кажу я. — Званок гэты я нікому не пакажу, а незычліўцаў у Беларусі хоць гаць гаці. Так што прашу ваша меркаванне даслаць мне пісьмова". І такімі лістамі ў маладыя гады я шмат каго турбаваў. Прыкладам, ЦК. Можа, зараз мала каму вядома, а я адзін з першых звярнуўся да цэкоўскіх чыноўнікаў, каб колішняя вуліца Максіма Горкага набыла законнае права быць вуліцай Максіма Багдановіча.

— Уладзімір Ілліч! Колькі вас ведаю, ні разу не чула, каб вы размаўлялі па-расійску. Што б гэта значыла?

— А значыць, што я не маю пакуль аніякай патрэбы гаварыць па-расійску. Цалкам задавальняю ўсе свае моўныя патрэбы на роднай мове. Гэта не азначае, што я не ведаю расійскай мовы ці ігнарую яе. Проста не маю патрэбы на ёй весці сумоўе ў межах Беларусі, а можа, і не толькі, а і ў межах усяго славянскага свету. Гэта што да вуснай мовы. Што ж да пісьмовай, то тут такое для творчасці багацце, што не маю ніякага параўнання. Жывое беларускае слова неабсяжнае. Рускага слова мы так не ведаем. Пісаць ды й гаварыць на беларускай мове адна асалода!

— Кожны прыходзіць да ўсведамлення сваёй беларускасці па-рознаму. Напрыклад, мы з Аляксеем Марачкевічам, калі ён вярнуўся на Беларусь з украінскай вёскі, дзе пэўны час настаўнічаў. Некаму дастаткова было ўсяго адной паездкі за мяжу або адной сустрэчы з цікавай творчай асобай, нават наведвання Дома літаратараў, дзе ў свой час Саюзам пісьменнікаў ладзіліся змястоўныя вечарыны, каб вярнуцца да беларушчыны, адчуць гонар за тое, што ты — беларус. А як і калі Вы прыйшлі да Беларусі?

— Мусіць, з часу народзінаў. Як нарадзіўся, дык у мову ўліўся, з мовай парадніўся. У нашай сям'і не ведалі іншай мовы... А вось абвостранае пачуццё беларускасці прыходзіла спакваля. Па меры таго, як я рос-падрастаў, не-не ды і чуў ад розных залётных у Беларусь гасцей пагардлівыя кепікі з нашай мовы. Мяне гэта моцна крыўдзіла. Некаторыя нават наўмысна, агрублялі нашу мову, нашы словы.

Калі ж я пачаў хадзіць у школу і пачуў, што наш Максім Багдановіч, узгадаваны ў Оасіі на лепшых узорах расійскай культуры, пісаў у Яраслаўлі пабеларуску, з той пары я больш нікому з крыўдзіцеляў нашай мовы не верыў. І ўсім незычліўцам беларушчыны казаў: "Крывадушнікі! Не ведаеце, што гаворыце... Гаворыце з чужога, варожага нам голасу!" Сваім перакананням я знайшоў моцную падтрымку ў Дуніна-Марцінкевіча, Багушэвіча, Купалы, Коласа... Дзіўлюся, што да гэтай пары на Беларусі шмат людзей, многія з якіх пры дзяржаўнай уладзе, не дайшлі да пераканаўчых довадаў і разважанняў нашых класікаў наконт таго, што такое ёсць наша мова для народа, нашае дзяржаўнасці.

— Вы аддалі тэлебачанню больш за 30 гадоў. А ці ёсць у вас зараз хоць якая повязь з тэлевізіяй?

— Аніякай — ні творчай, ні глядацкай. Гэтае я з болем перажываў і перажываю. Сучасная тэлевізія адбіла мяне нават ад экрана. Мой больш як трыццацігадовы вопыт застаўся незапатрабаваным. Калі я ішоў на пенсію, дык думаў, што хоць зрэдку дазволяць быць няштатным аўтарам. Але дзе там! Наша тэлевізія была асветніцкая, пазнаваўчая. А што зараз? Глядзець няма чаго. І мову з тэлевізійнага экрана выгналі. Няўжо сучасныя тэлевізійнікі не разумеюць, што яны ў нейкім сэнсе чыняць злачынства перад нашым народам, яго культураю? Быў час, калі вынішчалі, руйнавалі святыні, скідалі званы. І ўсё гэта рабілася пад дэвізам "перадавой" ідэалогіі. Зараз усё гэта паўсюль аднаўляюць. Што, і з моваю гэтак жа можна абысціся!

— Вы ўсё жыццё спазнаяце творчасць Ф.Багушэвіча, В.Дуніна-Марцінкевіча, Я.Купалы. Вы шмат падарожнічаеце, сустракаецеся з людзьмі, занатоўваеце іхнія ўспаміны, асэнсоўваеце, абагульняеце. Як вынік гэтых вандровак — вашыя кніжкі "Людзьмі звацца", "Пуцявінамі сейбіта", "Кушлянскі кут", "Жупранская старонка", "Свіранскія крэскі", "Сцежкамі Мацея Бурачка", "Карпілаўка", "Тут бачу свой край", "Умей слухаць", фотаальбомы пра Багушэвіча і Дуніна-Марцінкевіча. Раскажыце пра сваю першую кніжку.

— Першая мая кніжачка называлася шматзначна — "Людзьмі звацца". Лёс нашага народа, перспектывы яго развіцця сталіся сэнсам усяго майго жыцця. Яму адпавядае і ўвесь змест маёй першай кніжачкі. У ёй я ці не ўпершыню паспрабаваў асэнсаваць ролю нашых гімнаў у гісторыі станаўлення нацыянальнай свядомасці — ад Купалавага "А хто там ідзе?" да Клімковічавага "Мы, беларусы..". Мне хацелася згуртаваць беларусаў свету, дзе б яны ні жылі, пры якіх пасадах ні былі. Мо вы пра гэта не чулі, а сваю першую кніжачку ў свой час я паслаў нашым першым касманаўтам — Пятру Клімуку і Уладзіміру Кавалёнку. Мне хацелася, каб і яны ў космасе пачувалі сябе беларусамі, дзе б яны ні былі.

— Я з цікавасцю прачытала вашу чарговую кнігу "Волат з Мігаўкі"...

— Постаць Аляксандра Уласава для Беларусі шматзначная. Але як ні дзіўна, з ідэалагічных меркаванняў забытая, не ўшанаваная, не ўганараваная. Мы нават не ведаем, дзе яго апошняе прыстанішча. То хай згаданая мая кніжачка будзе памяткай пра гэтага нашага волата з Мігаўкі. Што ж да мяне, я з гэтай кніжачкай кожны дзень езджу ў метро. Гартаю яе. Хай нашы людцы хоць візуальна пазнаёмяцца з ёю. А раптам хто зацікавіцца?! А калі не, то хай постаць Уласава пабудзе прысутнай сярод пасажыраў мінскага метро. Аляксандр Уласаў вельмі любіў Менск. Паводле яго слоў, нават больш за Вільню.

— Вы нарадзіліся 13 верасня. Як гэтая лічба, якую шмат хто лічыць нешчаслівай, уплывае на ваша жыццё?

— Да лічбы 13 і я неабыякавы. Але ж у маім жыццяпісе значыцца другая, не менш жахлівая дата — 1937. Гэта год піку рэпрэсій на Беларусі. Можа, гэтыя дзве даты неяк генна спарадзілі ў мяне абвостраную ўпартасць супраць усялякай несправядлівасці. Між іншым, паводле маміных слоў, нарадзіўся я ў панядзелак, надвечар. Мама ў той дзень надрала дранікаў. Зранку яшчэ збегала ў лес, зрэзала колькі баровых рыжыкаў, і тут усё пачалося. Гэта ўсё я згадваю таму, што люблю і дранікі, і рыжыкі...

— І вось — ваш юбілей, 70-годдзе з дня народзінаў. Па маім глыбокім перакананні, 70 — гэта яшчэ далёка не старасць, хутчэй, я сказала б, — пашаноўная сталасць. З гэтай нагоды прыгадваецца, як у мае маладыя гады на аўтобуснай станцыі ў Глыбокім мы з Марачкіным разгаварыліся з мясцовым жыхаром пра ўзрост. Нам вельмі спадабалася ягонае вобразнае выказванне: "А я ўжо сямігодку скончыў, у восьмы перайшоў". Тады тэмы чалавек здаваўся мне вельмі старым. Мінула больш за 40 гадоў. Маё стаўленне да людзей такога шаноўнага веку змянілася. Ці адчуваеце вы свой век?

— Вядома, адчуваю. Творчаму чалавеку, прынамсі мне, павінны быць якіясь творчыя імпульсы. Гэтыя імпульсы— штуршкі патрэбны як паветра. Было б толькі здароўе! А вось пераважная большасць людзей, сярод іх нямала чыноўнікаў, жывуць абы жыць. Ім не шчыміць сэрца за лёс краіны, яе мовы, культуры. Тут і ўзрост ні пры чым, калі за душою няма нічога. А якраз такіх часцей за ўсё і прызначаюць на высокія пасады. Людзі са шчырымі парываннямі душы пакутуюць з-за іхняга раўнадушша.

Вы, Ірына, былі сведкаю майго шасцідзесяцігадовага юбілею. Гэта было ў 1997 годзе пад страхою славутага Купалавага дома — у музеі. З той пары мінула дзесяць гадоў... Аглянуцца не паспелі, як семдзесят наляцелі!.. Ці памятаецца Вам дух і аўра той вечарыны?

— Памятаю. Вечарына доўжылася больш за чатыры гадзіны. вас прыйшлі павітаць Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін... Вечарыну паказвалі па тэлевізіі. І не адзін раз...

— Зараз творчых людзей падзялілі на "сваіх" і "чужых", на запатрабаваных і незапатрабаваных. Але, нягледзячы на ўсе палітычныя зігзагі, не будзем складваць рукі. Напярэдзе Марцінкевічаў двухсотгадовы юбілей, сотая гадавіна з часу выхаду Купалавай "Жалейкі"...

— Маё апошняе пытанне традыцыйнае. Чым збіраецеся парадаваць прыхільнікаў вашага таленту ў самы блізкі час?

— Чарговая мая кніжачка мае быць "Карльзберг". Ці чулі хоць калі такі назоў?

— Чаму ж не чула... Пра гэтую мясціну і яе загадкавую назву мне распавядала сяброўка з Маладзечаншчыны Еўдакія Мацюш. А сёння піва такое па тэлевізіі рэкламуюць.

— А я рэкламую колішні маёнтак Сніткаў, буйных землеўладальнікаў і асветнікаў, якія жылі паблізу Радашкавічаў і шмат чаго зрабілі для асветы простага люду, паляпшэння яго побыту. Вось пра гэта і будзе мой аповед. Між іншым, род Сніткаў быў параднёны з Аляксандрам Уласавым. Пра гэта таксама ў новай кніжачцы будзе згадана.

Апроч усяго, Ірына, я — дзіця вайны. Хоць і быў тады невялікім хлопчыкам, але мінулая трагедыя глыбока прасякнула ўсю маю істоту. Маю з вайны фізічнае калецтва. Дык вось, мой абавязак — напісаць споведную кніжку пра маю вайну. Першая яе частка ўжо напісана і надрукавана ў "Полымі". На другую частку ўжо разварушана душа.

Шмат і іншых задумак. Хацелася б выдаць кніжачку пра Люцінку. У мяне ж багаты фотаархіў. Чуў ад Язэпа Янушкевіча, ён уваходзіць у юбілейны камітэт па святкаванні 200-годдзя з дня народзінаў В.Дуніна-Марцінкевіча, што да гэтага юбілею будзе перавыдадзены мой фотаальбом "Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч". Калі гэта праўда, я буду шчаслівы, нягледзячы на тое, што нарадзіўся 13-га ды яшчэ ў 1937 годзе... Не забывайцеся, што і мой унучак Сяржук творчы чалавек. Абедзве яго кніжачкі — "Святло маёй крыніччкі" і "Кветка мая Беларусь" — гэта і мой клопат. Мару да заканчэння ім школы выдаць з ім яшчэ адну супольную кніжачку. Гэта будзе зборнічак досціпаў, смяшынак, жартовак. Падрыхтаваў зборнічак "Беларускіх народных апавяданняў" у маіх запісах па ўзоры Ф.Багушэвіча. А каб гэта ўсё здзейсніць, трэба даўжэй жыць, хаця б гэтулькі, як мая матуля. Ёй зараз амаль дзевяноста, і яна мне гэтага зычыць. Мрою пра хроніку Багушэвічавай сядзібы. Мае віленскія сябры, сярод якіх Юрась Гіль, мяркуюць выдаць да канца гэтага года нашу сумесную кніжку "Францішак Багушэвіч у Вільні".

— Хай спраўдзяцца вашыя задумы.

ВІНШУЕМ!

За адданасць...

У Мінску адбылося ўручэнне прэміі імя Дзмітрыя Завадскага "За мужнасць і прафесіяналізм". Гэтую прэмію штогод уручаюць рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Беларуская асацыяцыя журналістаў" (БАЖ), Фонд імя Дзмітрыя Завадскага і Першы тэлеканал (Расія). Прэмія была заснавана шэсць гадоў таму па ініцыятыве калег Д.Завадскага, расійскіх журналістаў, у памяць аб бясследна зніклым тэлеаператары.

Сёлета прэміі атрымалі журналісты **Наталля Макушына** (Гродна), **Анатоль Гатоўчыц** (Гомель) і **Генадзь Барбарыч** (Мінск). Як зазначыў на цырымоніі ўручэння аглядальнік Першага тэлеканала **Павел Шарамет**, беларускім журналістам, асабліва ў рэгіёнах, вельмі няпроста працаваць па сваёй спецыяльнасці, даносіць да людзей праўду. П.Шарамет зачытаў віншаванне з гэтай нагоды гендырэктара Першага тэлеканала **Канстанціна Эрнста**.

У гэты ж дзень быў уручаны ганаровы дыплом імя беларускага журналіста Ігара Германчука "За адданасць прынцыпам свабоды слова". Ён быў заснаваны ў 2005 годзе, праз тры гады пасля смерці вядомага беларускага выдаўца і журналіста, Нарвежскім ПЭН-клубам і арганізацыяй "Human Rights House" сумесна з БАЖ.

Дыплом атрымаў галоўны рэдактар газеты "Народная воля" **Іосіф Сярэдзіч**. Ён зазначыў, што гэта ўзнагарода падкрэслівае менавіта грамадзянскую мужнасць, паколькі Ігар Германчук быў не толькі рэдактарам і журналістам, але і актыўным грамадскім дзеячам.

Сяргей ПУЛЬША.

ЧУЛІ?

Лён — праклён?

Колькасць ільнозаводаў можа быць скарочана да 25. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі падчас нарады па льнаводстве.

Зараз у Беларусі 49 заводаў. Такім чынам, лёс амаль паловы існуючых прадпрыемстваў застаецца нявызначаным. Пакуль плануецца пакінуць іх у якасці філіялаў альбо цэхаў. *"Але гэтыя пытанні яшчэ патрабуюць абмеркавання і дадатковай прапрацоўкі, паколькі льнозаводы знаходзяцца ў раённых цэнтрах і з'яўляюцца горадаўтвараючымі прадпрыемствамі"*, — зазначыў кіраўнік урада. З другога боку, ільнаводства ў Беларусі ўжо на працягу некалькіх гадоў з'яўляецца стратнай галіной, нягледзячы на рост попыту на льноволакно ў свеце. І з гэтым трэба нешта рабіць.

Алена НОВІКАВА.

SOS!

«Я свайго сына не дзеля таго пасылаў у армію...»

У рэдакцыю прыйшоў чытач, сын якога служыць дэсантнікам адной з вайсковых часцей Беларусі, і расказаў, каго робяць з яго сына ў беларускай арміі.

Факты, якія ён распавёў са слоў сына, шчыра скажам, не новыя, і тым не менш... У майго суразмоўцы была толькі адзіная просьба — не называць яго прозвішча.

"Сяргея прызвалі ў армію летам гэтага года, — распавядае мужчына. — Патрапіў у дэсантныя войскі, мы ганарыліся. Эліта! Але тое, што сын нам затым расказваў аб сваёй службе, перавярнула ўсё маё ўяўленне аб гэтай самай "эліце"... Першае, што ўразіла сына па прыездзе ў вайсковую часць, — "у дупель" п'яны прапаршчык, які павінен быў выдаваць форму. Выйшаў, паглядзеў на ўсіх мутным вокам і... сышоў. Напэўна, дабаўляць, бо праз паўгадзіны з'явіўся яшчэ больш п'яны. Вельмі нязвыклымі, але даволі калярытнымі выглядалі і мацюкі афіцэрскага складу. А прамова зампаліта на адной з лекцый для маладых салдат больш нагадвала тыраду блатнога "зэка" пасля доўгіх гадоў адсідкі. Дык што ж тады атрымліваецца? Я аддаваў у армію сына дзеля таго, каб з яго зрабілі там "блатнякa"? Мы паехалі да сына ў госці, дык у яго ўжо зараз таксама праз слова — мат. "Прабачце, — кажа, — прызвычаіўся". Аднак гэта яшчэ паўбяды. Б'юць жа яшчэ! Сын расказваў, што прапаршчык дык нават не хаваецца, а ходзіць з дубінкай і за любое парушэнне, прабачце, ставіць маладых салдат ракам (галавой трэба ўпірацца ў падлогу) і б'е іх па задніцы і вушах. Маўляў, так хутчэй выхавае. Што тут казаць пра стараслужачых, калі самі афіцэры такое вытвараюць? Апошнія цудоўна ведаюць пра дзедаўшчыну, але, як яны самі кажуць, гэта дапамагае падтрымаць у арміі дысцыпліну. Але якая тут дысцыпліна, калі ў дэсанце і так сур'ёзныя нагрузкі, а тут яшчэ такі псіхалагічны ціск! І што гэта за зборы "дзядоў" з маладых па 40—50 тысяч рублёў? У вайсковай часці, дарэчы, ёсць святары. Дык, можа, варта, каб яны сабралі афіцэрскі састаў ды пагаварылі з імі аб чалавекалюбстве і прыстойнасці. Паўтаруся: сын заўсёды марыў служыць у дэсанце, але зараз кажа: "Прыйду дадому, буду ўсім казаць, каб не ішлі служыць у гэты дурдом".

КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

Мы звязаліся з начальнікам прэс-службы Міністэрства абароны Беларусі **Вячаславам РАМЕНЬЧЫКАМ,** расказалі яму сітуацыю, і вось што ён параіў: *"Калі такія факты на самай справе маюць месца, але па вядомых прычынах салдат ці яго родныя не хочуць называць сябе, можна патэлефанаваць па тэлефонах даверу Міністэрства абароны. Кваліфікаваны псіхолаг і спецыяліст пагутараць і, калі ёсць неабходнасць, зафіксуе факты, пасля чаго будуць прыняты адпаведныя меры. Тэлефоны даверу: (0172) 97-16-35, 97-16-36".*

Алесь СІВЫ.

СТОЛИЦА

«Европа» в пять звезд

Как сообщалось, в Минске накануне Дня города открылся отель "Европа".

Ушли высокие гости — и перед входом оказался только служащий в фирменной куртке и фуражке с крупной надписью "EUROPA". Новичок-служащий еще даже толком не знал, как реагировать на посетителей.

Корреспонденту "Народной воли" отель не показался роскошным: зеркала, стекло, мрамор, мебель от "Бобруйскмебель" и "Пинскдрев", светильники из Лиды... На видном месте на рецепции лежала книга для почетных гостей. В ней, правда, пока не было ни одной записи.

"Европа" построена в форме атриума, при подъеме и спуске на стеклянном панорамном лифте можно обозревать входные двери номеров, так что все гости и служащие без проблем будут знать, кто куда входит и с кем. В отеле 67 номеров, есть паркинг, ночной клуб, турецкая баня, бассейн... Но если это то, чем Минск хотел удивить зарубежных гостей, то что-то в проекте все-таки не додумали.

Галина ЕФИМОВА.

СІТУАЦЫЯ

У мінскіх крамах могуць быць перабоі з малочнымі прадуктамі

У мінскіх крамах могуць быць перабоі з малочнымі прадуктамі. Такія аб'явы з'явіліся на іх дзвярах. У аб'явах нават называюць прычыну — недахоп сыравіны на малаказаводах. Зусім нядаўна скончылася лета, трава яшчэ зялёная, і каровам ежы хапае. Чаму тады на малаказаводах стала менш малака? Магчыма, прычына ў тым, што падняліся кошты на сухое малако, і Беларусь адпраўляе яго на экспарт.

Аб'яву мы пабачылі на краме "Авоська" па вуліцы Кузьмы Чорнага. У самой краме нам пацвердзілі інфармацыю пра недахоп сыравіны і параілі званіць на малаказаводы.

"На заводах не хапае сыравіны для вытворчасці належнага аб'ёму тавараў".

Малаказавод №3 г.Мінска пацвердзіў "Еўрарадыё", што сыравіны да іх сапраўды паступае менш. Чаму — яны дакладна не ведаюць, але мяркуюць, што ўсё ідзе ў Расію на продаж.

"Ну няма сыравіны. Не ведаю. Не пастаўляюць сыравіны. Можа, яна ідзе кудысьці ў Расію. Не хапае нам. Мы самі заклапочаны гэтым, мы таксама хочам грошы зарабляць. Гэта ж усё не таму, што мы не хочам вырабляць малако! Мы сухога малака не робім. Я не ведаю, можа, і таму, што сухое робяць ці масла, — я ж кажу, на Расію ідзе! Што ў нас ідзе ў Расію — сухое малако".

У Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання "Еўрарадыё" паведамілі, што міжнародныя кошты на сухое малако падскочылі ў два разы. І пакуль малаказаводы, як мінскі №3, пакутуюць ад страт без сыравіны, яна перапрацоўваецца і вывозіцца. Кіраўнік аддзела інфармацыі, кантролю і сувязі з прэсай Міністэрства сельскай гаспадаркі Мікалай Чупік лічыць, што гэта цудоўна.

"Возяць малако — на здароўе! — сушаць малако. А чаму б не сушыць малако, калі ляжаць гэтыя сыры дзесяткамі, дваццаткамі найменняў, псуюцца. Малако таксама псуецца, бо яго не раскупляюць. Чаму б не зрабіць сухое малако, у яго большы тэрмін захоўвання, можна рэалізаваць. Кошты падняліся значна на сухое цэльнае і сухое абястлушчанае малако. У свеце падняліся кошты ў два разы! Таму разумны гаспадар робіць эканоміку. Вырабляе сухое малако, прадае".

У Міністэрстве сельскай гаспадаркі лічаць, што аб'явы ў крамах не павінны будараж ыць людзей.

"Вы ж сыходзьце з зацікаўленасці дзяржавы! Адмова суседзяў не можа быць праблемай дзяржавы, прынамсі, не заўсёды. Нехта не завёз малака, можа, гэта разгільдзяйства нейкага кіраўніка — не забяспечыў сыравінай. Гэта не значыць, што трэба выносіць гэта і абмяркоўваць. Праца ў кожнага мусіць быць адна: не будараж ыць грамадскую думку. У нас мусіць быць адна задача: насельніцтва мусіць быць упэўнена".

"Еўрарадыё".



Народная Воля http://www.nv-online.info
13 ВЕРАСНЯ 2007 г.

ЮБІЛЕЙ

«Баімся Бога і больш нікога»

На мінулым тыдні свой дзесяцігадовы юбілей адзначыў незарэгістраваны «Малады фронт»

Мерапрыемства прайшло без эксцэсаў і затрыманняў, хаця як звычайна ў падобных выпадках, перад управай БНФ, дзе і адбываўся ўрачысты сход, дзяжурылі некалькі чалавек у цывільным. Яны пільна сачылі за тым, хто ўваходзіць і выходзіць з памяшкання. Але гэтым іх цікавасць да мерапрыемства была вычарпана.

У некаторым сэнсе свята маладафронтаўцам сапсавалі сталічныя ўлады. Справа ў тым, што маладыя людзі дамовіліся з гарадскімі службамі наконт таго, што да юбілею "Маладога фронту" будуць адрамантаваны прыступкі перад управай БНФ. Аднак камунальнікі пра сваё абяцанне забыліся...

Вёў сход колішні старшыня "Маладога фронту" Павел Севярынец, які прапанаваў пачаць урачыстую частку з выканання гімна "Магутны Божа", пасля чаго воклічамі "Жыве Беларусь!" былі павітаны тыя маладафронтаўцы, якія па аб'ектыўных прычынах не змаглі прысутнічаць на ўрачыстасці — Зміцер Дашкевіч і Артур Фінькевіч, якія адбываюць пакаранні.

Затым распачаліся святочныя прамовы. Як і належыць, першым далі слова аксакалам беларускай палітыкі. Мікола Статкевіч адзначыў: *"Я прыйшоў да тых людзей, перад якімі палітыкі старэйшага пакалення павінны знясць капелюшы"*.

У сваю чаргу старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка і экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта Беларусі Аляксандр Мілінкевіч даслалі маладафронтаўцам пісьмовыя віншаванні.

З юбілеем незарэгістраваны "Малады фронт" павіншавала таксама і амбасадар ЗША ў Беларусі. У сваім прывітальным слове Карэн Сцюарт адзначыла: *"Ад імя Злучаных Штатаў Амерыкі я хацела б павіншаваць "Малады фронт" з дзесятай гадавінай стварэння. Я ведаю, з якой самаахвярнасцю вы і вашы сябры імкнецеся зрабіць Беларусь дэмакратычнай і свабоднай. Са свайго боку Злучаныя Штаты працягваюць заклікаць беларускі рэжым вызваліць палітычных зняволеных, у тым ліку вашых сяброў па "Маладым фронце" Зміцера Дашкевіча і Артура Фінькевіча. "Малады фронт" даўно, што з'яўляецца надзвычай важным элементам у намаганнях беларусаў рэфармаваць сваю краіну і наблізіць яе да сапраўды аб'яднанай і свабоднай Еўропы. Энтузіязм і адданасць сяброў "Маладога фронту" даюць Беларусі прамень надзеі на лепшую будучыню і ўяўляюць сабой выдатны прыклад грамадзянскай мужнасці і самаахвярнасці для маладых людзей з усіх краін свету"*.

Вядома, што ў свой час праз "Малады фронт" прайшлі многія вядомыя ў Беларусі людзі — музычны прадзюсер Віталь Супрановіч, журналіст Вольга Анцыповіч, юрысты Уладзімір Лабковіч і Валянцін Стэфановіч... Апошні ў сваёй святочнай прамове сказаў: *"Малады фронт" для мяне — гэта свабода. Свабода асобы. Думаю, што кожны з прысутных добра ўсведамляе, што такое сапраўдная свабода, і разам мы пабудуем тую Беларусь, дзе не будзе палітычных пераследаў, збіцця актывістаў, арыштаў, дзе будуць найперш паважацца правы асобы"*.

Натуральна, што на юбілей незарэгістраванага "Маладога фронту" завіталі людзі, якія стаялі ля яго вытокаў, — Сяржук Бахун, Аляксей Шэін, Аляксей Шыдлоўскі. Дарэчы, нагадаем, Шыдлоўскі ў свой час трапіў за краты за тое, што ўзняў над Стаўбцоўскім райвыканкамам бел-чырвона-белы сцяг. Ён узгадвае: *"Пасяджэнні "Маладога фронту" дзесяць гадоў таму праходзілі тут, ва ўправе БНФ, кожны чацвер. Мы абмяркоўвалі план дзеянняў, гутарылі, спрачаліся. Мэта ў нас была адна, якая актуальна і сёння — свабода для Беларусі. Але сённяшняму пакаленню маладафронтаўцаў складаней, чым было ў свой час нам. Бо дзесяць гадоў таму не саджалі за прыналежнасць да ствараемай арганізацыі. Таму можна толькі радавацца, што і сёння ў краіне ёсць сапраўдныя патрыёты, для якіх свабода Радзімы важней за ўласную свабоду. Я вельмі рады, што справа, якую мы пачалі дзесяць гадоў таму, жыве і знаходзіцца ў моцных маладых руках"*.

Сённяшняе пакаленне "Маладога фронту" церпіць неймаверны ціск з боку ўлад. Напэўна, ні адна з грамадскіх суполак не адчула на сабе столькі арыштаў і судоў: Зміцер Дашкевіч і Артур Фінькевіч, Зміцер Федарук, Барыс Гарэцкі, Іван Шыла, Наста Палажанка, Наста Азарка... І гэта толькі самыя гучныя справы, а праз судовы канвеер прайшлі тысячы маладых людзей па ўсёй Беларусі...

Праіснаваць ва ўмовах аўтарытарнай Беларусі пад сілу далёка не кожнай грамадскай структуры. За гэты час шмат якія, у тым ліку і маладзёжныя, арганізацыі памерлі, ледзь нарадзіўшыся. У чым жа фенамен маладафронтаўцаў? Над гэтым пытаннем паразважаў шматгадовы маладзёжны лідэр Павел Севярынец: *"Недастаткова было проста тэхналогіі для таго, каб стаць такімі. Недастаткова было проста пратэсту і нейкага маладзёжнага задору. Нешта было ў сэрцы маладафронтаўцаў, і ў гэтым фенамен. У чым сэнс нашага змагання? Мы дакладна сфармiравалі для сябе ўласнае крэда — мы верым у Бога, мы любім Беларусь, а значыць, мы пераможам. Баімся Бога і больш нікога. І супраць гэтага бяссільныя амапаўцы, унутраныя войскі, бронетэхніка, карныя загады. Бо гэты стрыжань не разбіць, не спыніць, не стрымаць"*.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч вяртаецца ў Мінск?

Ён будзе пастаўлены на чале Мінска-Магілёўскай архіепархіі, заняўшы месца кардынала Казіміра Свёнтэка, які ў мінулым годзе быў адпраўлены на пенсію. Як перадае "Інтэрфакс", пра гэта паведаміла італьянская газета "Джорнале".

Кандрусевіч нарадзіўся ў Беларусі, а ў 1988 годзе пачаў тут епіскапскую дзейнасць. У Маскву Тадэвуш Кандрусевіч быў пераведзены ў 1990-х гадах.

Па інфармацыі італьянскага выдання, Папа Рымскі Бенядзікт XVI хутчэй за ўсё на кафедру ў Маскве прызначыць італьянца Паола Пецы.

Выданне адзначае, што афіцыйна пра прызначэнні можа быць паведамлена ў канцы верасня.

ЧУЛІ?

Мінск стане сталіцай камуністаў

3—5 лістапада ў Мінску адбудзецца сустрэча прадстаўнікоў камуністычных партый. У інтэрв'ю БелаПАН сакратар Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Георгій Атаманаў зазначыў, што свой удзел у сустрэчы ўжо пацвердзілі камуністы з 60 краін.

Сустрэча арганізуецца ў межах святкавання 90-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Пасля яе дэлегацыі плануюць накіравацца на святочныя мерапрыемствы ў Маскву.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Пачаўся суд над службовымі асобамі «Віцязя»

У Віцебскім абласным судзе агалошана абвінавачванне і пачаліся допыты абвінавачаных і сведкаў па справе "Віцязя". Усяго па гэтай крымінальнай справе на 64 тамы праходзяць 145 сведкаў. Судовыя слуханні, як чакаецца, будуць доўжыцца сама мала месяц.

Справа супраць былых дырэктара па маркетынгу і якасці "Віцязя", начальніка бюро камплектацыі аддзела забеспячэння, інжынера аналітычнага цэнтра, а таксама кіраўніка прадстаўніцтва замежнай кампаніі ў Беларусі вялася Галоўным упраўленнем папярэдняга расследавання МУС.

Службовыя асобы абвінавачаны ў атрыманні хабару на агульную суму 200 тысяч долараў, крадзяжах грашовых сродкаў прадпрыемства ў буйных памерах, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, звязанай з атрыманнем даходаў у асабліва буйных памерах. Агулам незаконны даход абвінавачаных склаў болей за 8 мільярдаў рублёў.

На лаве падсудных тры чалавекі. Былы дырэктар па маркетынгу віцебскага прадпрыемства абвешчаны ў вышук.

Алена НОВІКАВА.

ОСОБАЯ ТЕМА

Как бы вы хотели умереть?

*В этом году главврач первого в Беларуси хосписа для взрослых **Ольга МЫЧКО** была удостоена звания "Минчанин года".*

Чем не повод поговорить о службе, которая только-только зарождается в нашей стране, решили мы и позвонили Ольге Викторовне.

... Старое двухэтажное здание на улице Стахановской ничем не отличается от соседних построек: серое, невзрачное, угрюмое. Но это только снаружи, внутри дом №19 —- это светлые, уютные кабинеты, аккуратные палаты, современная мебель. Все сотрудники дружелюбны, улыбчивы, приветливы. В этом доме не чувствуешь смерти, хотя сюда приходят за помощью те, кто безнадежно болен и кому, возможно, осталось жить год-полтора.

Аднак, падкрэслю, асноўны сэнс склікання пазачарговага пленума быў звязаны з іншым пытаннем. Як вядома, 20 чэрвеня Прэзідыум БСДП нечакана для многіх партыйцаў прыняў рашэнне аб выключэнні з партыі кіраўніка Магілёўскай абласной арганізацыі Юрыя Новікава: "за сістэматычнае і ўсвядомленае супрацьдзеянне" лініі партыі па прынцыповых пытаннях. Магілёўскі абкам не пагадзіўся з такім рашэннем. Яго сябры палічылі, што кіраўніцтва Грамады, прымаючы да Новікава радыкальную меру палітычнага пакарання, груба парушыла партыйны статут. Абкам не прызнаў рашэнне Прэзідыума і выказаў недавер кіраўніцтву БСДП.

Аналагічную пазіцыю заняў Мінскі абкам, які таксама палічыў выключэнне Новікава з партыі неабгрунтаваным і выказаў недавер кіраўніцтву Грамады. Менавіта сябры Мінскага абкама і выступілі з ініцыятывай склікання пазачарговага пленума ЦК, менавіта яны распачалі збор подпісаў сябраў ЦК, якія пагадзіліся з іх ініцыятывай...

Адным словам, Грамада ў чарговы раз пагрузілася ў разборкі. Унутраныя супярэчнасці, суб'ектывізм яе лідэраў у чарговы раз завялі беларускую сацыял-дэмакратыю ў балота дробнай валтузні і самаедства. Здавалася б, пленум павінен быў даць гэтай палітычнай бязглуздзіцы, гэтаму палітычнаму ідыятызму (які не адзін год вызначае паводзіны пэўнай часткі партыйнай эліты) прынцыповую ацэнку. І рашуча паставіць на месца тых, хто стварыў канфліктную сітуацыю, эгаістычна выкарыстоўвае яе ў вузка групавых мэтах. Але пленум усяго толькі прыпыніў рашэнне Прэзідыума да чарговага пасяджэння і стварыў адмысловую камісію, якая вывучыць пытанне. Што і казаць, саламонава рашэнне. Чарговы пленум адбудзецца праз некалькі месяцаў (можа, праз тры, пяць). Увесь гэты час бакі партыйнага канфлікту будуць валтузіцца, паглыбляць супярэчнасці. Інакш кажучы, будуць змагацца не з рэжымам, а са сваімі партыйнымі апанентамі. А гэта якраз тое, што патрэбна ўладзе.

На пленуме разглядаліся некаторыя іншыя пытанні. У прыватнасці, ён ухваліў работу Прэзідыума па падрыхтоўцы да ўдзелу БСДП у палітычнай кампаніі "Выбары ў Палату прадстаўнікоў". Цікава, што першапачаткова на разгляд была ўнесена прапанова ўхваліць і працягваць работу па падрыхтоўцы да названай палітычнай кампаніі пры той умове, што ўлада выканае чатыры патрабаванні беларускай і міжнароднай грамадскасці адносна дэмакратызацыі выбарчага працэсу ў краіне. Аднак партыйнае кіраўніцтва пераканала ЦК у тым, што не варта так рашуча ставіць пытанне. Адзін з грамадоўцаў на гэта адрэагаваў так: відаць, маюць пэўную рацыю тыя, хто кажа, што ўдзел у палітычнай кампаніі "Выбары ў Палату прадстаўнікоў" на існуючых умовах лье ваду на млын рэжыму, спрыяе яго легітымізацыі.

Яшчэ сярод грамадоўцаў пашыраецца думка, што партыя імкліва набліжаецца да мяжы, за якой пачынаецца самаразбурэнне. Хочацца спадзявацца, што яны памыляюцца.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Віцебшчына вінаградная

Акрыяным вярнуўся з латвійскага горада Юрмалы пажылы віцябчанін Віктар Кухараў. Там на Міжнароднай канферэнцыі па вырошчванні вінаграду ў паўночных краінах даклад беларуса не згубіўся на фоне паведамленняў буйных навукоўцаў і селекцыянераў. Віцебскі садавод-аматар, абапіраючыся толькі на свой асабісты досвед, пераканаўча даказаў, што ва ўмовах паўночнай Беларусі можна вырошчваць буйнаплодны вінаград. Каля 200 гатункаў такога Кухараў культывуе на 15 сотках свайго лецішча. Дасягненнямі віцебскага вінаградара зацікавіліся селекцыянеры з Англіі, Галандыі, ЗША, Канады, Латвіі, Польшчы і Фінляндыі.

— Наша глеба не дужа спрыяльная для вінаграду, — тлумачыць Вадзім Эльевіч, — яе трэба зрабіць лёгкай, аэраванай, забяспечыўшы доступ паветра да каранёў.

Гэта — толькі адзін са шматлікіх сакрэтаў, якія мусіць ведаць вінаградар. Праўда, апошнім часам з'явілася шмат адмысловай літаратуры для аматараў вырошчвання вінаграднай лазы ва ўмовах паўночных краін. Ды і асабісты досвед аматары не хаваюць ад людзей, ахвотна дзеляцца сваімі ведамі з усімі, хто да іх звяртаецца.

Шэрагі вінаградараў на Віцебшчыне растуць, і можна спадзявацца, што прыйдзе час, калі вінаграднае віно пад назвай "Віцебскае" будзе сапернічаць з бургундскім і рэйнскім.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
13 ВЕРАСНЯ 2007 г.

ЗА КАДРОМ

Евгений Булка и Инна Афанасьева попали в «Холостяки»

Ведущими нового реалити-шоу канала ОНТ "Три холостяка" стали Евгений Булка и Инна Афанасьева. Эта яркая пара очень полюбилась публике еще во время проекта "Две звезды". На минувшей неделе в одном из ангаров под Минском был снят имиджевый ролик ведущих, где Евгений Булка выступает в образе "а-ля Джеймс Бонд".

"Когда мне позвонили с ОНТ и предложили вести вместе с Инной "Три холостяка", естественно, я с радостью согласился, — рассказывает Булка. — И для Инны это немного необычное амплуа. Все говорят, что наша пара нравится публике, а мне очень приятно и интересно работать с Инной, нравится ее чувство юмора. Кстати, в ролике ведущих я не играю роль Джеймса Бонда, просто выступаю там как Евгений Булка, который несколько отличается от Булки из Comedy Club. Хоть в "Трех холостяках" тоже вряд ли найдутся поводы для грусти, обещаю, мы с Инной будем излучать оптимизм и жизнерадостность. К тому же, в отличие от Афанасьевой, я выступаю на стороне холостяков".

Напомним, Евгений Булка и сам был не против принять участие в проекте в качестве одного из трех холостяков и даже специально из Сочи приехал на кастинг. Впрочем, ведущий до сих пор не оставляет надежды с помощью реалити-шоу найти свою вторую половинку.

"Я не раз говорил, что верю: в жизни есть место для чуда. А вдруг действительно встречу на шоу свою судьбу? По крайней мере я не исключаю такую возможность", — признался Булка.

Первое шоу "Три холостяка", где из девяти участников будут определены три самых популярных холостяка, будет показано в эфире ОНТ 23 сентября.

naviny.by

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Шоколад, от которого не толстеют

Правда ли, что существует шоколад, от которого худеют? Чем он отличается от обычного шоколада?

Ирина ВОЙТИЧ, Гомель.

К сожалению, на сегодня не изобретено сладостей, потребляя которые можно было бы еще и похудеть. Но шоколад, от которого не полнеют, действительно есть. Это продукт "Коммунарки" — не дающая жировых отложений "Талия" с ароматом ананаса, где вместо сахара использована декстроза.

Появился этот шоколад благодаря первоапрельской шутке одного из белорусских телеканалов. В сюжете было рассказано про начало выпуска нового шоколада, помогающего сохранить стройность. Как обычно, многие поверили и стали звонить на фабрику с просьбой рассказать, где продается новый продукт. Работникам фабрики пришлось "сдаться" и разработать рецептуру новинки.

Состав этого шоколада отличается от любимой всеми "Аленки" наличием декстрозы, отсутствием сахара и сухих сливок. А вот калорийность "Талии" (539 ккал/100 г.) и "Аленки" (553 ккал/100 г.) — отличается не сильно...

К сожалению, больше узнать о самом шоколаде и его особенностях нам не удалось, так как работники фабрики "Коммунарка" категорически отказались более подробно рассказать о шоколаде "Талия".

Кстати, как написано на сайте "Коммунарки", "Талия" — молочный шоколад. А во всем мире самым полезным считается горький. Черный горький шоколад без всяких начинок и добавок — самый полезный. В нем содержится больше фенолов, которые связывают вредные свободные радикалы, и в то же время он содержит значительно меньше жира, чем молочный и белый. Горький шоколад, по уверению диетологов, наименее вреден, так как в нем содержится больше какао-бобов, чем сахара. Следом за горьким по степени вредности следует белый, который изготавливают из какаомасла с добавлением сахара. Ну а более всего вредит талии так называемый молочный шоколад, в котором какао-бобы сочетаются с какао-маслом и сухим молоком — не говоря про дополнительные радости в виде орехов или изюма.

Ольга ПРУДНИКОВА.

ПЕРСОНА

Бела МАСУМЯН, народная артистка Беларуси:

«Пока у меня еще есть вкус к жизни...»

15 сентября в Национальном академическом русском театре им. М.Горького отметят юбилей народной артистки Беларуси Белы Масумян. В этот день Бела Амиковна вместе с народной артисткой Натальей Гайдой сыграет одну из главных ролей в премьерном спектакле по пьесе Ивана Вырыпаева "Валентинов день". Сейчас Бела Масумян буквально живет на сцене — идут репетиции, которые заканчиваются поздно вечером.

Бела Амиковна не избалована вниманием журналистов, она довольно редко дает интервью. Однако несмотря на катастрофическую нехватку свободного времени Бела Масумян согласилась встретиться с репортером "Народной воли".

— Бела Амиковна, как я понимаю, у вас нет белорусских корней...

—Да, вы совершенно правы. Мой папа — армянин, а мама — полька. Мой отец был военным летчиком, поэтому мы объездили тогда еще большую страну, были часто за границей. Но в итоге остановились в Вильнюсе. Там я окончила школу, затем поступила в Белорусский театрально-художественный институт и получила почетное приглашение работать в Национальном академическом драматическом театре им. М. Горького. В Беларуси я живу с 1957 года.

— Как вы считаете, молодым актерам, только-только окончившим вуз, сразу должны предлагать главные роли? Или вначале им надо попробовать свои силы в массовке?

— Все достаточно индивидуально. Если в спектакле требуется молодой герой, то чего же ждать актеру, когда он постареет, чтобы сыграть эту роль? Но пройти через массовки обязан каждый артист. Актер должен уметь делать все! Помню, как к нам в театр пригласили двух замечательных артистов — Анатолия Солоницына и Владимира Портнова. Несмотря на звездные имена, они были задействованы в массовке. Но так больше никто не ходил по сцене, как Солоницын!

— Бела Амиковна, вы больше сорока лет на сцене. Наверное, без театра жизни уже просто не представляете...

— Да. И в другой профессии тоже себя не представляю. Я ведь с самого детства знала, что буду актрисой. Правда, воплотить в жизнь эту мечту мне удалось не с первой попытки. Дело в том, что в 1957 году я поступала в московскую "Щепку". Прошла собеседование, причем попала сразу во второй тур отбора, но в списке свою фамилию не нашла. Этим же вечером я уехала домой в Вильнюс. Потом уже узнала, что меня зачислили, а я смотрела совсем не те списки... Наверное, так было угодно судьбе. Потому что сразу по приезде в Вильнюс я узнала, что Дмитрий Алексеевич Орлов набирает свой курс. Так я поступила в Белорусский театрально-художественный институт.

— Случается ли вам ходить в театр не как на работу, а в качестве обычного зрителя?

— Чаще всего я и хожу как зритель. Я очень люблю театр.

— Бела Амиковна, по гороскопу вы — Дева. Если верить астрологии, вы должны быть весьма спокойной и уравновешенной...

— Не скажу, что я такая уж спокойная и уравновешенная. Хотя пунктуальная, педантичная, люблю во всем чистоту и порядок. Словом, я разная.

— Что для вас сейчас самое ценное в жизни?

— Сама жизнь. Чем ближе к краю, тем она дороже. Пока у меня еще есть вкус к жизни.

— Вам будет 70. Наверное, вам многие говорят, что вы выглядите гораздо моложе...

— Я этого не нахожу. К своему стыду я не посещаю никакие спортивные центры. Но я по натуре трудоголик. Много физически работаю дома, на даче, хотя там нет сада и огорода, а только газон и цветы. Еще люблю ходить пешком, гулять.

Я достаточно критично отношусь к себе, по натуре я самоед! А для актрисы это очень плохо. Любое критическое замечание в свой адрес анализирую, думаю, почему мне его сделали. Мне не нравится в людях категоричность — она всегда ранит. Поэтому сама я всегда очень осторожно делаю людям замечания...

— Говорят, после драки кулаками не машут. Но все-таки: что бы вы изменили или сделали в своей жизни чуть иначе?

— Наверное, менять ничего не стала бы. Только вернула бы тех людей, которых уже нет с нами. Вернула бы своего дорогого отца, своих однокурсников, друзей.

— Бела Амиковна, вы стали народной артисткой Беларуси 12 лет назад. Многие говорят, что вас надо было отметить гораздо раньше...

— Получила, когда получила. Жаль, что папа не дожил до того момента, когда мне дали звание народной...

— В сегодняшнем репертуаре Русского театра у вас не так много ролей.

— Я считаю, что актер должен скучать по ролям. Мне кажется, после каждой сыгранной роли нужно остановиться, подумать, поскучать немного, а потом снова играть.

— В антрепризе "Валентинов день" вы с Натальей Гайдой делите одного мужчину...

— Да, мы делим память и любовь к человеку, которого уже с нами нет. И это гораздо сложнее. По сценарию две женщины страстно влюблены в одного и того же мужчину. Обе настойчиво требуют его внимания: одна — на правах жены, другая — на правах любовницы. Но он всегда любил только одну из них...

— Бела Амиковна, а как вы обычно празднуете свой день рождения?

— Я никогда не приглашаю гостей. Так что это первый раз, когда я вообще отмечаю день рождения. В театре на юбилей приглашена вся труппа. Афиши висят на каждом шагу — кто захочет, тот сам придет и поздравит. Я буду рада всем...

Сергей ДМИТРИЕВ.
Фото автора.

ЧУЛІ?

У Аляксандра Абдулава — рак лёгкіх

Мастацкі кіраўнік тэатра "Ленком" Марк Захараў, які днямі вярнуўся з Ізаіля, паведаміў, што ізраільскія медыкі паставілі вядомаму расійскаму артысту Аляксандру Абдулаву страшны дыягназ — рак лёгкіх.

"Я быў рады пабачыць жывога, вясёлага Аляксандра Гаўрылавіча, які ведае пра свой дыягназ, але гатовы змагацца са сваёй хваробай, — сказаў Захараў. — *Зараз ён знаходзіцца на лячэнні ў адной з самых лепшых ізраільскіх клінік. Пры самым добрым цячэнні хваробы і яе лячэнні Абдулаў зможа вярнуцца на працу ў тэатр напрыканцы сезона. Іншы варыянт нават і не хочацца абмяркоўваць".*

У бліжэйшы час Абдулаву прыйдзецца прайсці два курсы хіміятэрапіі.

Как безопасно съездить за границу

17—19 сентября в кинотеатре "Победа" ОО "Белорусская ассоциация молодых христианских женщин" проводит Дни открытых дверей программы "Ла Страда" по безопасному выезду за границу.

На открытии акции выступит белорусская группа "Dali". В рамках акции состоятся бесплатные кинопоказы фильмов — призеров престижных международных кинофестивалей.

Президентская библиотека переедет

Судьба старого здания Национальной библиотеки Беларуси (НББ) будет решаться в Управлении делами президента. Об этом сообщил замминистра культуры Валерий Гедройц.

Бывшее здание Национальной библиотеки на улице Красноармейской, возведенное в 1932 году по проекту известного белорусского архитектора Георгия Лаврова, является памятником архитектуры конструктивизма. По словам замминистра, предложения Министерства культуры по его использованию после того, как НББ переехала в новое здание по проспекту Независимости, не были учтены. Вместе с тем В.Гедройц отказался конкретизировать эти предложения министерства.

Как стало известно БелаПАН, в бывшем здании НББ планируется размещение Президентской библиотеки, которая сейчас находится в Доме правительства.

БЛІЦ

Першая прыгажуня Мінска вучыцца на хіміка-тэхнолага, але марыць стаць псіхолагам

Студэнтку Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта Васілісу Рымжу (на фота) назвалі першай прыгажуняй Мінска. Прадстаўнікі журы конкурсу лічаць, што яна — беларускі варыянт Наомі Кэмпбел.

Трэба адзначыць, што рэпарцёра "Народнай волі" на конкурс прыгажосці "Міс Мінска" не акрэдытавалі. Чаму — дакладна не вядома. Таму з першай сталічнай прыгажуняй мы гутарылі ўжо на наступны дзень пасля конкурсу.

— Васіліса, скажыце, ці шмат для вас значыць гэтая перамога?

— Я пакуль гэтага не ўсвядоміла. Мне проста было цікава паспрабаваць свае сілы ў гэтым конкурсе. Пра перамогу я нават і не марыла. Думала, калі займу нейкае месца — добра. Калі не — ну ды што зробіш... Для мяне было дасягненнем трапіць у лік 16 лепшых. Скажу шчыра: вынік для мяне не так важны, як удзел у конкурсе.

— Цяпер вы плануеце ўзяць удзел у конкурсе "Міс Беларусь". Як ацэньваеце свае шанцы?

— Буду спадзявацца на перамогу, як, напэўна, і ўсе астатнія дзяўчаты.

— Калі не сакрэт, ваша сэрца занята?

— Гэта так важна?

— Проста цікава ведаць, якія якасці павінен мець хлопец, які знаходзіцца побач з такой прыгажуняй...

— Гэты чалавек павінен быць добрым, не раўнівым, зразумела, кахаць мяне і дастаўляць толькі прыемныя эмоцыі.

— Напэўна, вас ужо закідалі прапановамі аб супрацоўніцтве...

— Не. Я застаюся ў Нацыянальнай школе прыгажосці.

— А як жа вучоба? Не плануеце перайсці на завочнае аддзяленне?

— Пакуль не. Буду сумяшчаць працу і вучобу. Мяркую, што спраўлюся. Скажу шчыра: мне не хочацца працаваць па сваёй асноўнай спецыяльнасці — інжынер, хімік-тэхнолаг. Я планую атрымаць яшчэ другую вышэйшую адукацыю — хачу стаць псіхолагам.

Сяргей ДЗМІТРЫЕЎ.

ДАРЭЧЫ

Першай віцэ-міс аб'яўлена студэнтка Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі Надзея Палявечка. Ёй жа дастаўся і прыз глядацкіх сімпатый.

Другой віцэ-міс стала Кацярына Любчык, студэнтка БДЭУ.

Званне "Міс чароўнасць" прысудзілі студэнтцы БДЭУ Васіліне Вялічцы.

"Міс фота" абралі 19-гадовую Вольгу Броннікаву, студэнтку Інстытута прадпрымальніцтва.

Беларусы ўбачаць нямецкія кінанавінкі раней за расіян і ўкраінцаў

Выдаткі мытных законаў і інструкцый іграюць на руку кінагурманам. У рамках "Фэсту новага нямецкага кіно: Мінск-2007" беларусы змогуць убачыць нямецкія фільмы — удзельнікі і прызёры буйнейшых сусветных кінафестываляў, а таксама невядомыя фільмы рэжысёра "Парфумера" і "Бягі, Лола, бягі" Тома Тыквера на паўгода раней "пракатнай" Масквы.

Дыстрыб'ютэр кампаніі "GermanFilms" Валерый Канішчаў кажа, што ў Беларусі не ведаюць сучаснае нямецкае кіно.

"Та нямецкая кінатворчасць, з якой знаёмы ў Беларусі, з'яўляецца вельмі малым працэнтам ад таго, што адбываецца ў Германіі, — гаворыць Канішчаў. — *А менавіта зараз нямецкі кінематограф узыходзіць на новую прыступку развіцця, якую адзначаюць і гледачы, і крытыкі. Таму ў супрацоўніцтве з "GermanFilms" і мінскім пракатам мы прывезлі два новыя паўнаметражныя нямецкія фільмы і дзве раннія кароткаметражныя працы Тыквера".*

Усе прадстаўленыя працы — фестывальнае кіно. Гэта не блокбастэры, разлічаныя на касавыя апараты. Фільм "Лета 04" Стэфана Кромера "аб'ездзіў" 18 фестываляў, у тым ліку Каны, Афіны, Мельбурн, Варшаву і Берлін. У галоўнай ролі — Марціна Гедек, вядомая па фільме "Жыццё іншых", які атрымаў сёлета "Оскар". Фільм аб простых чалавечых радасцях і нягодах, што становіцца тэндэнцыяй нямецкага кінематографа, адыходзячага ад тэм палітыкі і гісторыі. "Адзін мой сябрук" Себасцьяна Шыпера — больш масавая прадукцыя, разлічаная на сярэдняга гледача. Абодва фільмы зняты не масцітымі рэжысёрамі, а былымі акцёрамі, што гарантуе нам сустрэчу з сапраўды маладым нямецкім кінапрадуктам.

Кожны сеанс будзе складацца з двух блокаў: паказ адной з заяўленых паўнаметражных стужак, а таксама кароткаметражны фільм Тома Тыквера.

"Беларусы ўбачаць прэм'еры раней сваіх суседзяў з-за таго, што беларуская мытня пакуль працуе так, што мы не ў стане даставіць кіно з Беларусі ў Расію і Украіну, — тлумачыць Валерый Канішчаў. — *Выдаткі па дыстрыб'юцыі стужак праз Беларусь проста неадэкватныя. Прасцей і танней потым адправіць фільмы з Мюнхена ў Маскву і Кіеў".*

Арганізатары паказу фэсту новага нямецкага кіно вялі перамовы аб запрашэнні самога Тома Тыквера для сустрэчы з гледачамі. Аднак працоўны графік рэжысёра, занятага запускам новай карціны, не дазволіў планам увасобіцца ў жыццё.

"Але мы не гаворым, што тэма яго прыезду закрытая, не выключана, што калі-небудзь ён усё ж такі прыедзе ў Мінск ", — паабяцаў Валерый Канішчаў.

Вольга ПРУДНІКАВА.

Дзе: Дом кіно, вул. Талбухіна, 18.

Калі: 14, 15, 16 верасня; сеансы ў 17.00, 19.00, 21.00.

Колькі: кошт аднаго сеансу — 6000 руб.

Увага! На сеансы не дапускаюцца гледачы, якім не споўнілася 16 гадоў.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

«Крама» выпусціла новы альбом. І гэта — не дзіўны сон

Беларускі рок-гурт "Крама" выпусціў восьмы па ліку альбом — дыск "Усё жыццё — дзіўны сон".

"Крама", якую "культурныя" ідэолагі ўнеслі ў "чорны спіс", сцвярджаючы, што ў музыкаў "нізкі мастацкі ўзровень", не змагла правесці ў Мінску нармальную канцэртную прэзентацыю дыска, бо гурту проста не далі памяшканне. Дакладней, у гэтай гісторыі было столькі ўсялякіх перашкод з боку ўлад, што аказалася прасцей прэзентаваць альбом у Польшчы на рок-фестывалі "Басовішча". І тым не менш прэзентацыя дыска ў Мінску (хоць і без канцэрта) усё ж такі адбылася.

— Пакуль ніхто не забараніў магазінам прымаць дыскі "Крамы" на продаж, — кажа аўтар многіх песень рок-гурта **Зміцер ЛУКАШУК**, які быў і застаецца добрым сябрам "Крамы".

На мерапрыемстве, якое ладзілася ў адным са сталічных клубаў, усе прысутныя маглі не толькі набыць дыскі з аўтографамі вакаліста Ігара Варашкевіча, гітарыста Сяргея Трухановіча і барабаншчыка Андрэя Філатава, але і сфатаграфавацца з музыкамі. Дыскі, трэба адзначыць, "размялі" ў імгненне вока.

"Да справы падышлі адказна — альбом рыхтаваўся каля года, — распавядае мне **Ігар ВАРАШКЕВІЧ**. — *А цяпер 22 верасня адпраўляемся на рок-фестываль, які адбудзецца ў Луцку".*

Трэба адзначыць, што да прэзентацыі гэтым летам вакаліст "Крамы" паспеў сумясціць прыемнае з карысным: упершыню сеў у лодку і адправіўся па рэках Беларусі.

"Сябра прапанаваў, — кажа ён. — Два дні сплаўляліся па рачулцы Сула, пад Вілейку ездзілі... Сумяшчаў турызм, адпачынак і творчасць. Плыў на байдарцы першы раз у жыцці, аднак нават не перакуліўся. Надзейная лодка — рабілі яшчэ на савецкіх абарончых заводах".

Алесь СІВЫ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
13 ВЕРАСНЯ 2007 г.

ГОРКА!

Яшчэ адно золата для Наталлі Гелах

У мінулыя выхадныя чэмпіёнка свету па акадэмічным веславанні Наталля Гелах выйшла замуж за валейбаліста Вячаслава Гуца.

Золата на сусветным першынстве Наталля заваявала за тыдзень да вяселля, што стала, безумоўна, адным з самых прыемных падарункаў да святочнага мерапрыемства.

Спартсменка, якая жыве ў Брэсце, каханага знайшла там жа: Вячаслаў гуляе за мясцовую валейбольную каманду "Заходні Буг". А падыходзяць маладыя адзін аднаму вельмі добра! Нават пры немаленькім росце Наталлі (1 м 90 см) яна глядзіцца вельмі мініяцюрна ў параўнанні з атлетычным мужам, рост якога аж 2 метры 5 сантыметраў.

— Пасля пекінскай Алімпіяды можна будзе падумаць і аб папаўненні ў сям'і, — кажа Наталля Гелах.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЁСЦЬ РЭКОРД!

Вячаслаў Харанека з піва перайшоў на каньяк

Беларускі кароль гір Вячаслаў Харанека ўстанавіў свой юбілейны — 125-ы — рэкорд у экстрэмальным уздыманні цяжкасцяў.

Рэдкі для Харанекі выпадак. Але рэкорд быў усталяваны па-за межамі Беларусі. Вячаслава запрасілі на святкаванне 860-годдзя Масквы, дзе ён цягам трох гадзін уздымаў кег вагой у 40 кілаграмаў. *"Мяне ў чарговы раз запрасілі на Міжнародны фестываль рэкардсменаў Кнігі рэкордаў Гінеса, дзе і папрасілі ўсталяваць рэкорд. Я адразу вырашыў, што паспрабую ўзняць кег 860 разоў. Такім чынам за тры гадзіны на прамых руках я ўзняў больш за 34 тоны"*, — сказаў карэспандэнту "Народнай волі" Вячаслаў Харанека.

Варта адзначыць, што сваё новае дасягненне Харанека усталяваў, парамагаючы страшэнныя пакуты. *"Падчас выступлення абвастрыўся боль у спіне — нагадала пра сябе старая траўма. Было вельмі балюча, але, ахвяруючы здароўем, рэкорд усё ж усталяваў"*, — адзначыў асілак.

Звычайна кег на выступленнях Вячаслава Харанекі напаўняюць вадой альбо півам. У Маскве ці то вады з півам не знайшлося, ці то арганізатары палічылі, што напаўняць кег гэтымі вадкасцямі несалідна... Карацей кажучы, у кег налілі... каньяк. *"Я да алкаголю стаўлюся не вельмі станоўча. На выступленнях патрабую, каб налівалі ў кег ваду, ну максімум — піва. З каньяком "працаваў" упершыню. Праўда пакаштаваць яго мне не давялося. Кег адразу пасля выступлення некуды ўкацілі"*, — распавёў асілак.

Варта адзначыць, што, у адрозненне ад маскоўскіх, мінскія ўлады ад паслуг рэкардсмена адмовіліся. *"Калі Мінск адзначаў 940-гадовы юбілей, я выступіў з паказальнымі выступленнямі, хаця і настройваўся на рэкорд. Заяўляў, што гатовы ўсталяваць рэкорд дома. Аднак цікавасці гэта не выклікала. Сам я спонсараў не шукаў. Ды што там спонсараў! Грошы не галоўнае. Знайсці хаця б арганізацыю, якая б мяне змагла банальна застрахаваць у выпадку чаго... Я не пакрыўджаны, проста хацелася юбілейны рэкорд паставіць на дзень народзінаў Мінска, але, што называецца, не лёс..."* — паскардзіўся Вячаслаў Харанека.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ФУТБОЛ

Брэндт ШТАНГЕ:

«Беларусь будзе ісці сваім шляхам»

Нацыянальная зборная Беларусі саступіла румынам у чарговым матчы адборачнага турніру да чэмпіянату Еўропы-2008 года з лікам 1:3

Хаця беларуская зборная яшчэ да гульні з румынамі згубіла нават тэарэтычныя шанцы на пападанне на чэмпіянат Еўропы, хатнюю сустрэчу з румынамі балельшчыкі чакалі з нецярпеннем. Пасля перамогі над Ізраілем у таварыскай сустрэчы сэрцы балельшчыкаў зноўку напоўніліся аптымізмам. Маўляў, з прыходам на трэнерскі мосцік немца Штанге зборная абавязкова загуляе ў прыгожы, а галоўнае — выніковы футбол.

Няма сэнсу крытыкаваць Штанге за гэтае паражэнне. Па-першае, нямецкі трэнер зусім нядаўна працуе з беларускай зборнай. Па-другое, пры ўсёй павазе да беларускіх футбалістаў выбар у Штанге невялікі. Ігракоў, якія на роўных могуць сапернічаць з моцнымі еўрапейскімі камандамі, не так шмат. Адсюль і вынік, які нагадвае старое як свет школьнае правіла — ад перамены месц складаемых сума не мяняецца. Здаецца, хто б ні кіраваў зборнай, каманда вышэй галавы не скокне. За ўсю гісторыю выступленняў беларускай зборнай такое было толькі аднойчы — пры Малафееве, калі мы рэальна прэтэндавалі на выхад у фінальную частку чэмпіянату свету. Але калі тое было?..

На сённяшнім этапе развіцця беларускай зборнай Штанге праводзіць палітыку амаладжэння кадраў. У лініі абароны з румынамі гулялі маладыя Цігараў і Радзькоў.

Пры гэтым нямецкі спецыяліст, прыступаючы да працы з нашай камандай, не абяцаў хуткага выніку: маўляў, мы рэалісты і пакуль не павінны быць рамантыкамі. Што, уласна кажучы, і пацвердзіў пасляматчавы каментарый нямецкага спецыяліста. "Калі глядзець на ўсю гульню ў цэлым, то ў нас ёсць нацыянальная каманда, якая можа добра гуляць. Многія пасля гэтага матчу расчараваны, але настрой у мяне аптымістычны. Беларусь будзе ісці сваім шляхам", — сказаў Штанге.

КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА

Валерый МЕЛЬНІКАЎ, чэмпіён у складзе мінскага «Дынама» 1982 года: «Вышэй галавы не скокнеш»

— Ведаеце, гульня пакінула добрае ўражанне. Не ў сэнсе заваявання ачкоў, а ў сэнсе паказанай гульні. Воку было прыемна назіраць. Канечне, нямецкі спецыяліст яшчэ не так доўга працуе з беларускай зборнай. На маю думку, ён памыліўся ў падборы ігракоў. Асабліва гэта датычыцца лініі абароны. Калі ў паўабароне і нападзенні нейкая зладжанасць была, то пра абарону гэтага сказаць нельга. Зборная паказала хуткі, месцамі цікавы футбол. Хай не пакрыўдзіцца на мяне экс-галоўны трэнер зборнай Беларусі Юрый Пунтус, але я даўно не бачыў, каб нашы футбалісты змаглі зрабіць пяць запар дакладных перадач адзін аднаму. У матчы з румынамі гэта атрымлівалася, таму каманда і гуляла ў камбінацыйны футбол. А румынам у сваю чаргу ўдалося спалучыць прагматызм у дзеяннях і добры футбол, які прынёс вынік. Зразумела, што індывідуальна румыны памацней, таму беларусы маглі супрацьпаставіць сапернику толькі калектыўную зладжанасць і самааддачу.

Калі наша зборная пачне перамагаць? Пытанне складанае. Мяркую, што і ў наступным адборачным цыкле ў нас шанцаў не так шмат. Вышэй галавы не скокнеш. Рэальны патэнцыял беларускай зборнай — гэта трэцяе-чацвёртае месца пры любых сапернiках па групе. Рэсурсу на нешта больш значнае ў Беларусі на сённяшні дзень проста няма. Калі б у нашай зборнай гуляла 11 Аляксандраў Глебаў ці Максаў Рамашчанкаў, тады можна было б разлічваць на тое, што з тымі ж румынамі мы будзем гуляць на роўных...

Што да Штанге, то ён мне нагадвае саракагадовага Эдуарда Малафеева. Той жа агонь у вачах, добрая ўсмешка, жартачкі-прымаўкі... Бачна, што хлопцам камфортна ў камандзе, ім хочацца гуляць і дасягаць вынікаў. Пакуль нямецкі спецыяліст толькі знаёміцца з магчымасцямі сваіх падначаленых. Зразумела, без памылак гэтага зрабіць нельга, што і паказала сустрэча з румынскай камандай. Не буду называць прозвішчаў, але некаторыя ігракі на месца ў нацыянальнай зборнай яшчэ не напрацавалі. Аднак у трэнерскага штаба нашай зборнай, відавочна, сваё бачанне сітуацыі. Таму ім і карты ў рукі...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

В ЯБЛОЧКО!

Биатлонистам дали новый срок

На прошлой неделе Александр Лукашенко подписал Указ о продлении государственной поддержки белорусского биатлона

Точнее сказать — о поддержке унитарного предприятия "Белорусский клуб биатлона", учредителем которого является Белорусская федерация биатлона.

Известно, что первоначально появился Указ "О дополнительных мерах государственной поддержки унитарного предприятия "Белорусский клуб биатлона" от 4 августа 2005 года. Кроме всего прочего, в документе были оговорены и сроки такой поддержки — в течение двух лет.

Не дожидаясь окончания действия Указа, белорусская биатлонная общественность уже в начале это года начала "зондаж" почвы на предмет продления действия документа. Причем не на два года, а на три, что, собственно говоря, сейчас и сделано. Плюс ко всему, если раньше за биатлоном была "закреплена" чертова дюжина предприятий, то сейчас на одно прибавилось.

— *Это хорошая новость,* — сказал в беседе с корреспондентом "Народной воли" гостренер по биатлону **Александр БЕЛЯЕВ.** — *Биатлон любим в народе, имеет свои традиции, поэтому, думаю, в наш огород не будет камней по поводу того, что мы, мол, оказываемся в положении с некоторыми привилегиями. Для нас сейчас очень важно решать задачи подготовки резерва, а без финансов, сами понимаете...*

— Но, наверняка, за привилегии потребуют и отдачи?

— А что, за два года действия Указа у нас не было достижений? Были, конечно. Вложения в инфраструктуру тренировочного процесса, в подготовку молодых — это тоже сказывалось на результатах.

— Вот вы говорите о подготовке своего резерва, а результаты в команде почему-то показывают в основном российско-украинские "легионеры", которые стали белорусами...

— Не согласен. Что, Сыман плохие результаты показывает? Новиков — плохие? Кто в минувшем сезоне бежал лучше их? И потом... Весь цивилизованный мир уже давно не заглядывает в паспорта спортсменов на предмет того, где родился. У нас есть возможность вкладывать средства в подготовку своего резерва, и мы это делаем. Но если есть сильный спортсмен, который желает выступать за сборную Беларуси, то мы же не можем запрещать ему это делать только потому, что в паспорте у него написано, допустим, "татарин". В спорте, как в науке. Если ты имеешь знания и квалификацию, то национальность значения не имеет. Хотя, скажу вам, 99 процентов всех усилий у нас затрачиваются на работу внутри республики, со своими спортсменами. Другое дело, что в силу определенных условий, таланты у нас рождаются редко. Пушкины ведь тоже появляются нечасто, хотя все мы умеем писать. Сегодня в мире талантов, к сожалению, не так много, как хотелось бы. Повторюсь, основные усилия мы вкладываем в подготовку своих спортсменов и тренеров, но если есть люди, которые могут сделать это лучше, то, наверное, не надо бояться доверить им эту работу. За последние 6—8 лет у нас более 20 медалей на различных чемпионатах мира и Европы среди юниоров. А это же выигрывают все наши, доморощенные ребята. Правда, во взрослом спорте пока не получается конкурировать с сильнейшими, но, думаю, это временно.

Алесь СИВЫЙ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Не развітваемся...

Шаноўныя сябры!

На жаль, не ўсе з вас пералічылі грошы за верасняўскія нумары. Вялікая просьба: у бліжэйшыя дні наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Фінансавае становішча рэдакцыі вельмі і вельмі складанае.

Паўтараем: мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін. Не толькі за верасень, а можна і за два месяцы, і да канца года.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо печатными буквами и обязательно отправляется в редакцию с копией платежного документа

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

КОРАТКА

Шанцаў на чэмпіянат свету не шмат

Днямі Мінск наведалі прадстаўнікі Міжнароднай федэрацыі хакея з шайбай. Мэта візіту — азнаямленне з умовамі, у якіх Беларусь гатова прыняць адзін з наступных чэмпіянатаў свету.

"Убачанае пакінула добрае ўражанне. Мы будзем рэкамендаваць Міжнароднай федэрацыі хакея прадаставіць Беларусі права правесці сусветны чэмпіянат. Праўда, у барацьбе са Швецыяй і Чэхіяй, якія таксама хочуць прыняць чэмпіянат свету 2013 года, вам прыйдзецца не зусім проста, больш верагодным бачыцца 2014 год. У любым выпадку беларускія ўмовы лепшыя, чым былі, скажам, у Латвіі. У вас ужо зроблена вялікая праца, а латышы ўводзілі галоўную арэну першынства літаральна ў апошнія месяцы перад стартам", — адзначыў старшыня маркетынгавага камітэта Міжнароднай федэрацыі хакея Аляксандр Сцеблін.

З Італіі — з медалямі

На этапе Гран-пры па лёгкай атлетыцы ў Італіі беларускія спартсмены заваявалі тры медалі. Срэбраны медаль у кіданні молата заваяваў Іван Ціхан. Яго вынік 82 метры 61 сантыметр. Бронза ў гэтай дысцыпліне ў яшчэ аднаго беларуса — Вадзіма Дзевятоўскага. Яго вынік 79 метраў 59 сантыметраў.

У бегу на 800 метраў наша Святлана Усовіч заняла другое месца з вынікам 1 хвіліна 58,68 секунды.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 11.09.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №